*душу* ‘пра лжывага, няшчырага чалавека’: *<u>Нячы́сты</u> ты <u>на душу́</u>* [3, с. 160], *не папо́ва душа́* ‘пра сквапнага, прагнага чалавека’ [3, с. 160], *цыган за душой (на душы) сядзіць* ‘затоеная злосць ці калі сумленне точыць’ [2, с. 218]. У народных гаворках Ушаччыны сустракаецца фразеалагізм *упасці ў душу* ‘спадабацца, стаць як родны’: *І так малец ім у душу ўпаў, што дрыжаць як над родным* [2, с. 215].

**Заключэнне.** Як сведчыць дааследаваны моўны матэрыял, прааналізаваныя фразеалагічныя адзінкі дыялектнага паходжання даволі шырока рэпрэзентуюць асаблівасці хрысціянскага светабачання беларусаў. Так, устойлівыя выразы са структурным кампанентам *бог* маюць станоўчую канатацыю і змяшчаюць у сабе словы-звароты да Усявышняга. Фразеалагізмы з назоўнікавым кампанентам *чорт* маюць адмоўную канатацыю, што не з’яўляецца выпадковым, паколькі ў этнамоўнай карціне свету нашага народа гэтая міфічная істота традыцыйна надзялялася адмоўнымі якасцямі і асацыіравалася са злом. Кампанент *душа* ў складзе рэгіянальных фразеалагізмаў Віцебшчыны адлюстроўвае не толькі псіхічны стан чалавека, але і асаблівасці хрысціянскай веры ўвогуле.

Такім чынам, прааналізаваныя фразеалагізмы, якія шырока выкарыстоўваюцца ў народных гаворках Віцебскага рэгіёна, рэпрэзентуюць у сваёй семантыцы асаблівасці нацыянальнай рэчаіснасці, ментальнасці і паводзін нашых землякоў, пацвярджаючы той факт, што рэлігія выступае важным сродкам духоўнага выражэння беларускага народа.


1. Дзядова, А.С. Чалавек у люстэрку беларускай фразеалогіі і парэміялогіі : манаграфія / А.С. Дзядова. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013. – 161 с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/3208 (Дата доступу 02.09.2022)
2. Вушацкі словазбор Рыгора Барадуліна / укл. Н. Давыдзенка ; прадм. У. Някляева. – Мінск : Кнігазбор, 2013. – 388 с.
3. Мова Сенненшчыны : дыялектны слоўнік. У 2 т. Т. 1. А-О / Нац. акад. навук Беларускі, Цэнтр дservicelistслед. беларус. культуры, мовы і літ., Філ. “Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы” ; уклад.: Н.М. Бунько [і інш.] ; навук. рэд, В.М. Курцова, Л.П. Кунцэвіч. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 424 с.
4. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / склад.: Г.К. Семянькова, Т.А. Грачыха, А.С. Дзядова[і інш.]; пад рэд. А.С. Дзядовай. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2014. – Ч.2. – 358 с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/14042 (дата доступу 01.09.2022)


## “ХРАМ НАВУКІ” Ў ТВОРЧАСЦІ НАДЗЕІ ПЛАТОНАЎНЫ ЯРМАК


***Сак К.С.,***
*навучэнка групы 31Н Полацкага каледжа ВДУ імя П.М. Машэрава,*
*г. Полацк, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Сарасека Г.Г.,** магістр адукацыі*



Ключавыя словы. Біяграфія, педагог, тэма, вобраз, “храм навукі”.
Keywords. Biography, teacher, topic, image, “temple of science”.


Надзея Платонаўна Ярмак – выдатны педагог, Заслужаны настаўнік БССР. Мужная жанчына, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Таленавіты паэт, член літаратурнага аб’яднання “Наддзвінне”.

Творчасць Надзеі Платонаўны вельмі шматгранная. Аб гэтым сведчаць зборнікі яе твораў “Мир души”, “Разожги костер души”, “Мая папараць-кветка”, “Дастаць зорачку”, “Рэха дабрыні”, “Всего понемногу”, “Незабыўныя сцяжынкі і дарогі”. Значнае месца ў іх займаюць творы грамадзянска-патрыятычнай тэматыкі, прысвечаныя:

– роднаму гораду, землякам-сучаснікам, вядомым палачанам (“Наш Полацк”, “Табе, мой Полацк”, “Прывітанне, Полацк”, “Хлебам і соллю”, “Вітаем вас”, “Вуліца Скарыны”, “Мы ў Полацку жывем”, “Жанчынам”, “Скарынаўскае свята”, “Прывітальная”, “Добры дзень, землякі”, “Мой Полацкі край”);

– святу Перамогі, ветэранам, сябрам-аднапалчанам, а таксама тым, хто ніколі не вернецца, але памяць пра якіх жыве (“Мы – салдаты твае, Перамога”, “Са святам вызвалення”, “Зорныя сны”, “Курган”, “Дзень вызвалення”, “Гарматы б'юць”, “Лясныя салдаты”);

– роднай навучальнай установе, калегам, выпускнікам (“Наш родны дом”,“Навукі храм”, “О каледж!”, “Выпускникам”,“Премудрости свет”, “Мы – воспитатели”, “Дарагія калегі, сябры”, “Паходня ведаў”, “Моим ученикам”).

У год 150-годдзя каледжа асаблівую ўвагу мы звяртаем на творы, прысвечаныя Полацкаму каледжу ВДУ імя П.М. Машэрава, дзе яна працавала.

Мэта: выявіць спецыфіку рэалізацыі вобраза "храма навукі" (каледжа) у творчасці Н. П. Ярмак.

**Матэрыял і метады.** Аб'ект даследвання – творы Н. П. Ярмак са зборнікаў "Дастаць зорачку", "Рэха дабрыні", "Всего понемногу". Прадмет даследвання – вобраз "храма навукі" (каледжа) у творчасці Надзеі Платонаўны Ярмак**.** Метад даследвання – кантэкстуальны аналіз.

**Матэрыял і вынікі**. Вобраз каледжа неаднаразова з'яўляецца ў радках твораў паэткі зусім невыпадкова: Надзея Платонаўна адпрацавала ў Полацкім каледжы ВДУ імя П.М. Машэрава 50 гадоў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры. У 1948 годзе пасля заканчэння Мінскага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага яна вярнулася па размеркаванні ў родны Полацк, каб працаваць выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў педагагічным вучылішчы.

Пачатак прафесійнай дзейнасці, па словах маладой выкладчыцы, быў няпростым. Яе хвалявала тое, што вучыць неабходна дарослых, сталых студэнтаў, якія ўжо самі працуюць у школе. Як пачынала працаваць, як прыйшла на першае (як потым сталася, адзінае) рабочае месца, узгадвае ў нарысах-успамінах "Бывало и так", "Кто добрый?", "Я рада", "Первый урок". Аўтар распавядае чытачу, што пасля вайны заняткі для будучых настаўнікаў былі арганізаваныя ў памяшканнях Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра: "Я окончила Минский педагогический институт и начала работать в Полоцком педучилище, которое размещалось в кельях Спасо-Евфросиниевского монастыря на северной окраине города", "Прозвенел звонок. Я в аудиторию (а это кельи Спасо-Евфросиниевского монастыря) не иду", "Окончен институт. В кармане диплом с отличием, как говорится. Я приехала на работу в Полоцкое педучилище…В училище меня приняли и сказали, что через один день я должна выйти на работу, поскольку приезжают заочники".

У невялічкіх апавяданнях "На ўсё жыццё", "Як нараджаўся хор", "Первый блин", "Онкология", "Строим кооперативный дом", "Проверка", "Урок на всю жизнь", "Чтобы ты не поступила" вобраз вучылішча не з'яўляецца цэнтральным, ён уплецены ў кантэкст апісання гарадскога жыцця, таму што разлічаны на пэўнага чытача, магчыма, палачаніна ці госця горада.

Асобае месца ў творчай спадчыне выдатнай паэтэсы-палачанкі займаюць вершы-прысвячэнні роднай навучальнай установе: "Наш родны дом", "О каледж!", "У каледжы юбілей", "Навукі храм", у якіх вобраз каледжа створаны больш поўна, глыбока, падрабязна. Доўгі перыяд працы выкладчыкам, шчырая адданасць прафесіі настаўніка, сяброўскія адносіны з калегамі наклалі адбітак на змест і эмацыйны фон твораў. Кожны з названых вершаў мае зварот "наш каледж", што падкрэслівае асабліва блізкія, цёплыяадносіны да навучальнай установы. Аўтар з любоўю называе каледж не інакш, як родным домам:

Наш каледж, ты для нас родны дом.
Хай мільгаюць гады за акном,
Ты ў люстэрка глядзіш Палаты,
Паліш ведаў касцёр залаты.

Вобраз "храм навукі" сустракаецца ў вершы-прысвячэнні "Полацкаму ўніверсітэту-юбіляру" Генадзя Бураўкіна, у гімне Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, гэты ж вобраз пакладзены ў аснову і аднайменнага верша "Храм навукі" Надзеі Ярмак. Каледж для Надзеі Платонаўны - гэта сапраўды святое месца, як храм:

Наш каледж – навукі храм,
Тут сяброў вясёлых брацтва
Пакланяецца багам
Ведаў, мудрасці, мастацтва.

Пазіцыя Надзеі Платонаўны блізкая выкладчыкам і навучэнцам каледжа. Падчас адукацыйнага працэсу звяртаецца шмат увагі на выхаванне пачуцця гонару, павагі да роднай навучальнай установы, цікавасці да яе багатай гісторыі, педагагічнай і творчай спадчыны. Невыпадкова, што думкі Надзеі Платонаўны сугучныя з меркаваннем педаго-

гаў-сучаснікаў. Таму менавіта верш “Храм навукі” абраны гімнам нашага каледжа. Музыку да яго стварыў таксама выдатны выкладчык каледжа Уладзімір Аляксеевіч Масленікаў.

**Заключэнне.** Вобраз каледжа як “храма навукі” выразна выяўлены ў творчасці Надзеі Ярмак не толькі ў якасці элемента апісання гарадскога жыцця ў апавяданнях-мініяцюрах, але і як канкрэтны адрасат прысвячэнняў у вершах, насычаных пяшчотнымі пачуццямі, шчырай адданасцю роднай навучальнай установе.

1. Ярмак Надзея. Всего понемногу – Літаратурна-мастацкае выданне. На правах рукапісу. – Полацк, 2006. – 30 с.
2. Ярмак Надзея. Дастаць зорачку : вершы і песні – Літаратурна-мастацкае выданне. На правах рукапісу. – Полацк, 2001. – 87 с.
3. Ярмак Надзея. Рэха дабрыні: выбранае– Літаратурна-мастацкае выданне. На правах рукапісу. – Полацк, 2002. – 352 с.

## СПЕЦЫФІКА ДЫЗАЙНЕРСКАГА АФАРМЛЕННЯ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ВЫДАННЯ НА ПРЫКЛАДЗЕ ЧАСОПІСА “МАЛАДОСЦЬ”

***Селязень К.Я.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Навасельцава Г.В.,** канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Часопіс, дызайн, вокладка, колер, змест, фотаздымак.
Keywords. Magazine, design, cover, color, content, photo.

Для друкаваных сродкаў масавай інфармацыі важна захоўваць сваё праблемнае поле, утрымліваць чытацкую аўдыторыю. У сучасным медыйным асяроддзі традыцыйны літаратурны часопіс не губляе сваёй актуальнасці, паколькі назапасіў значны творчы вопыт і застаецца цікавым для сваіх чытачоў, увагу якіх прыцягвае ў тым ліку дзякуючы арыгінальнаму дызайнерскаму афармленню. У сувязі з вышэй сказаным мэтай даследавання выступае вывучэнне вопыту дызайнерскага афармлення сучаснага літаратурнага выдання на прыкладзе часопіса “Маладосць”.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам абраны штомесячны літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны ілюстраваны часопіс “Маладосць”, які выдаецца з красавіка 1953 года. Прааналізаваны выбраныя нумары выдання за розныя гады. Выкарыстаныя метад агляду СМІ, параўнальна-супастаўляльны метад.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Шматгадовая выдавецкая праца паспрыяла выпрацоўцы шэрагу правілаў, якія не страцілі сваёй значнасці і сёння. У прыватнасці, часопіс вылучаецца “цвёрдым” макетам, што азначае наяўнасць пастаянных рубрык і тэматычных палос, а таксама адносна ўстойлівага дызайнерскага афармлення, у выніку чаго ў чытацкім успрыманні фарміруецца пазнавальны вобраз. Рэдакцыя паслядоўна змяшчае празаічныя і паэтычныя творы аўтараў розных узростаў, чым рэалізуе прынцып творчай пераемнасці, менш паслядоўна гэтае правіла вытрымліваецца для калумністыкі, перакладаў, публіцыстычных матэрыялаў. Варта адзначыць, што цікавасць аўдыторыі ў значнай меры падтрымліваюць спецнумары і спецпраекты.

У афармленні часопіс мае шэраг пераваг над газетай. Дзякуючы высокай якасці паліграфіі ў дызайнера з’яўляецца магчымасць выкарыстоўваць значную колькасць сродкаў, якія дапамогуць прыцягнуць увагу чытачоў. Гэта могуць быць шрыфты, якасныя фотаздымкі, колеравая палітра і іншае. Разгледзім элементы дызайну на прыкладзе штомесячнага літаратурна-мастацкага часопіса “Маладосць”. Схема кожнага часопіса можа значна адрозніваецца і быць даволі скаданай, калі браць пад увагу раздзелы і іх размяшчэнне ў часопісе.

На вокладцы часопіса не размяшчаюцца ніякія матэрыялы, як гэта можна пабачыць на першай паласе газет. Гэта дазваляе выкарыстоўваць шрыфты вялікіх памераў і размяшчаць надпісы больш свабодна, што дапаможа чытачу лёгка знайсці патрэбную інфармацыю пра дадзены нумар. Так, на вокладцы можна пабачыць саму назву часопіса, дату з нумарам выпуску і анонсы [1].